# Наша біяграфія

Віцьбічы

**Лістапад 1990 года**

На сесіі гарсавета ўпершыню ішла канкрэтная размова аб стварэнні гарадской газеты. Было дадзена даручэнне пастаяннай дэпутацкай камісіі па галоснасці да наступнай сесіі падрыхтаваць адпаведнае рашэнне.

**21 студзеня 1991 года**

У сесіяй прымаецца рашэнне аб стварэнні друкаванага органа гарадскога Савета дэпутатаў. Галоўным рэдактарам выбіраецца старшыня пастаяннай дэпутацкай камісіі па галоснасці Н.Тулінава.

Неўзабаве ў Міністэрстве культуры і друку пад нумарам 333 была зарэгістравана гарадская газета "Віцьбічы".

**2 сакавіка 1991 года**

Выйшаў першы нумар газеты. Чатыры старонкі фарматам А3, у два колеры. Тыраж на той час складаў 3150 экземпляраў, працавалі 12 супрацоўнікаў.

Крыху пазней газета тым жа фарматам выходзіць па серадах і суботах. У кіёсках цана газеты — 10 капеек. У красавіку аб'яўляецца падпіска. Кошт на месяц — 80 капеек, на тры месяцы — 2 рублі 40 капеек.

**17 красавіка**

Уводзіцца пастаянная рубрыка "Аб тым, што баліць", якая заснуўваецца на пісьмах чытачоў. У адрас рэдакцыі паступаюць падзякі за канкрэтную дапамогу.

Газета пачынае адчуваць недахоп паперы і фінансавых сродкаў. Старшыня гарвыканкама Мікалай Федарчук і галоўны рэдактар Ніна Тулінава звяртаюцца па дапамогу да прадпрыемстваў. На просьбу адгукнуліся камбінат шаўковых тканін, дывановы камбінат, ВА "Маналіт", фабрыка "КІМ", СП "Белвест", фабрыка мастацкіх вырабаў "Купава", тэкстыльнае аб'яднанне і іншыя.

Гарадскі Савет дэпутатаў займаецца пошукам паперы. З гэтай мэтай у Мінск на прадпрыемства "Беллесбум" выязджае кансультант гарадскога Савета дэпутатаў Уладзімір Каташук. Наладжваюцца і замацоўваюцца сувязі — і па бартэру набываецца папера: за тэлевізары, абутак, калготкі, тканіну. Тавар прапаноўвалі прамысловыя прадпрыемствы.

У газету пачынаюць звяртацца рэкламадаўцы, друкуецца праграма тэлебачання. Таму пачынаючы з чэрвеня суботні нумар выходзіць аб'ёмам 6 старонак, а з 10 жніўня — 8 старонак.

(Заканчэнне на 2-й стар.).

# НАША БІЯГРАФІЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).*

●З мэтай павелічэння колькасці падпісчыкаў 7 жніўня рэдакцыя паведамляе аб правядзенні латарэі. Прызы прапанавалі прадпрыемствы, гандлёвыя базы. Розыгрыш латарэі адбываецца на камбінаце шаўковых тканін.

●25 сакавіка газета папаўняецца старонкай для моладзі "Ради тебя". З 1 жніўня выданне чытачы пачынаюць атрымліваць па серадах, пятніцах і суботах: чатыры старонкі ў сераду і пятніцу, восем — у суботу.

●6 сакавіка 1993 года ў вялікай зале культурна-дзелавога цэнтра адбылася першая сустрэча з чытачамі. Яна была арганізавана на сродкі спонсараў. З цягам часу такія сустрэчы сталі традыцыйнымі і былі прымеркаваны да дня выхаду першага нумара.

●Рэдакцыя арганізуе тэлефон даверу для таго, каб звярнуць увагу ўлады на неабходнасць псіхалагічнай дапамогі людзям. Рэдакцыйны кіёск адчыняе "акенца галоснасці": у вызначаныя дні (аб чым гараджане загадзя папярэджваліся праз газету) каля кіёска дзяжурылі журналісты з дыктафонам, і кожны мог на працягу дзвюх хвілін выказаць свой пункт погляду на тую ці іншую праблему з жыцця горада, падказаць цікавую тэму для газеты.

●У верасні камбінат шаўковых тканін перадае рэдакцыі настольна-друкарскую сістэму. Рэдакцыя праводзіць чарговую рэкламную кампанію ў гарадскім транспарце. У тралейбусах, дзе супрацоўнікі рэдакцыі вялі гутарку з пасажырамі, заклейваліся кампосцеры і людзі ехалі бясплатна.

●У 1994 годзе тыраж газеты дасягае 70131 экземпляра, 18000 з якіх — у раёнах вобласці. Газета выходзіць на васьмі старонках два разы ў тыдзень і адзін раз — на чатырох.

●На 1 студзеня 1995 года тыраж складае 74531 экземпляр. 18 лютага выходзіць першы нумар дзіцячай старонкі "Чамучка".

●З 21 сакавіка ў газеты тры заснавальнікі: акрамя гарадскога Савета дэпутатаў і калектыву рэдакцыі, заснавальнікам выступіў і гарадскі выканаўчы камітэт.

●24 сакавіка ў КДЦ — чарговы Дзень газеты "Віцьбічы".

●5 верасня з мэтай рэкламы газеты рэдакцыя задзейнічала тралейбус, дзе актыўна вялася падпіска.

●3 лістапада 1995 года выйшаў першы нумар газеты "Вячэрні Віцебск". Заснавальнікі — калектыў рэдакцыі і фірма "Марка".

●У 1996 годзе рэдакцыя арганізуе разнастайныя конкурсы для чытачоў. У красавіку праводзіць конкурс на лепшы матэрыял на экалагічную тэму. Прызавы фонд выдзяляе гарадская інспекцыя па экалогіі — 10 мільёнаў рублёў.

●"Віцьбічы" адмаўляюцца ад датацыі, выходзяць на самаакупнасць.

●18 мая шырока адзначаецца 5-гадовы юбілей газеты: масавыя гулянні, атракцыёны, канцэртная праграма на вуліцах горада. 19 мая адбыліся вялікі святочны канцэрт, сустрэча з чытачамі ў Летнім амфітэатры. Газета пачынае друкавацца на васьмі старонках тры разы ў тыдзень.

●1997 год — трывалае фінансавае становішча. Рэдакцыя пераязджае ў новае памяшканне (у будынак аблвыканкама), набывае новую тэхніку.

●У 1998 годзе ў сувязі з інфляцыяй фінансавае становішча пагаршаецца, узнікаюць цяжкасці з закупам паперы. Да студзеня 1999 года сітуацыя папраўляецца з дапамогай заснавальнікаў газеты.

●У 2000 годзе значна абнаўляецца тэхніка.

●Калектыў робіць усё магчымае, каб выйсці на самаакупнасць. Супрацоўнікі "Віцьбічаў" атрымліваюць перамогу ў многіх рэспубліканскіх і абласных конкурсах.

●2001 год пачынаецца ўпэўнена. Набываецца лічбавая фотакамера. У працоўных калектывах прадпрыемстваў і арганізацый горада адбываюцца сустрэчы з чытачамі.

Гэта коратка аб тым, як жыла газета 10 год. Спадзяёмся, што лепшае ў нас яшчэ наперадзе.